УДК 930.253(476.7)

# ПІНСК У МАЛЮНКАХ НАПАЛЕОНА ОРДЫ: НЕПАЎТОРНЫЯ ВОБРАЗЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

**В.Ф. Жылевіч**
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,
jilevitch@gmail.com

**Анатацыя.** Даследаванне прысвечана выяўленню спецыфікі адлюстравання архітэктурных пейзажаў горада Пінска ў малюнках Напалеона Орды.

**Ключавыя словы:** архітэктурны пейзаж, графічны твор, акварэль, Пінск, Напалеон Орда, італьянскі фартыфікацыйны стыль, тастамент

Напалеон Орда (1807–1883) – адзін з найвыбітнейшых людзей Беларусі. Мастак, музыкант, кампазітар, педагог, публіцыст, вучоны – М. Орда пакінуў нашчадкам больш за тысячу графічных твораў і акварэляў. У яго работах адлюстраваны архітэктурныя збудаванні і маёнткі вядомых людзей Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы, Францыі, Італіі, Іспаніі, Партугаліі, Галандыі і іншых краін Еўропы.

Н. Орда атрымаў адукацыю ў Свіслацкай гімназіі, затым вучыўся ў Віленскім універсітэце на фізіка-матэматычным факультэце. З-за ўдзелу ў таварыстве «Заране» ён быў выключаны з універсітэта і прыгавораны да турэмнага зняволення. У ходзе баявых дзеянняў паўстання 1830-1831 гг. М. Орда быў узнагароджаны «Ордэнам Воінскай доблесці» (Virtuti Militari) [2, с. 16]. Пасля падаўлення паўстання Н. Орда эміграваў у Францыю ў Парыж, дзе пазнаёміўся з творчасцю прадстаўнікоў еўрапейскай культуры таго часу: Дж. Расіні, Дж. Вердзі, Ж. Гуна, Г. Берліёзам, А. Бальзакам, А. Стэндалем, П. Віярда і інш. У Ф. Шапэна і Ф. Ліста ён навучаўся кампазіцыі і гульні на фартэпіяна. Будучы мастак браў урокі малявання ў студыі вядомага французскага майстра архітэктурнага пейзажа П. Жэрара. Н. Орда ўдзельнічаў у літаратурных вечарынах, суправаджаючы ігрой на фартэпіяна паэтычныя імправізацыі Адама Міцкевіча [3, с. 75]. З 1847 г. ён працаваў дыр-

эктарам Італьянскай оперы ў Парыжы. Н. Орда як публіцыст прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Вялікай эміграцыі.

У 1856 г. пасля абвяшчэння амністыі палітычным эмігрантам Н. Орда вярнуўся на радзіму ў вёску Варацэвічы. Н. Орда памёр у 76-гадовым узросце ў Варшаве. Паводле завяшчання ён быў пахаваны ў радавым магільным склепе ў Янове – цяпер горад Іванава Брэсцкай вобласці.

Жыццю і творчасці Н. Орды прысвечана значная колькасць навуковых работ гістарычнага, мастацтвазнаўчага і этнаграфічнага характару.

Даследаванню асаблівасцей архітэктурнай графікі ў малюнках Н. Орды прысвечаны працы А. М. Дзенісевіч [1], В. Клімчук [4], В. Левандаўскаса [5], Л. Несцярчука [6] і інш.

Нягледзячы на мноства публікацый, прысвечаных разгляду спадчыны Н. Орды, застаюцца малавывучанымі дакументы на французскай мове, якія асвятляюць яго жыццё. Ксеракопіі дакументаў былі перададзены ў Музей Беларускага Палесся ў жніўні 2009 г. нашчадкам Н. Орды – грамадзянінам Францыі Юберам Дэнармандзі падчас яго паездкі ў Беларусь.

*Мэта артыкула* – выявіць спецыфіку адлюстравання архітэктурных пейзажаў горада Пінска ў малюнках Напалеона Орды, а таксама ўвесці ў шырокі навуковы зварот некаторыя звесткі аб жыцці Н. Орды на аснове дакументаў на французскай мове, якія знаходзяцца ў асабістым архіве сям'і Дэнармандзі.

У Пінску мастак быў у 1868-1871 гг., зыходзячы з подпісаў на малюнках, прысвечаных гораду, якіх на сёння вядома сем [7, с. 160-163]. З іх найбольш знакаміты – малюнак з панарамай Пінска, на якім адлюстраваны агульны від горада з боку ракі (Мал. 1). На пярэднім плане – бераг, Піна, лодкі. Занатаваныя мастаком адна- і двухпавярховыя дамы, вядома, не захаваліся і сёння паўстаюць у змененым выглядзе. Шырокая дарога, якая на малюнку Н. Орды нібы падзяляе горад на дзве часткі, у сучасным выглядзе з'яўляецца працягам маста праз раку Піну. Справа на малюнку бачны двухвежавы парафіяльны касцёл і званіца. Злева знаходзіцца фрагмент трохпавярховага палаца – Пінскага езуіцкага калегіума. На малюнку маецца надпіс: "Касцёл францыска[нцаў]", які, на жаль, пашкоджаны. Палатно выканана алоўкам і падпраўлена акварэллю.



**Мал. 1. – Цыт. па [7, с. 160]**

Яшчэ адзін малюнак Н.Орды прысвечаны Францысканскаму касцёлу, які датуецца 1871 годам (Мал. 2.). На пярэднім плане – сакральная статуя. На малюнку мы бачым не галоўны фасад касцёла, а тарэц кляштарнага корпуса з барочным франтонам. Палатно выканана алоўкам.



**Мал. 2. – Цыт. па [7, с. 163]**

Для таго каб параўнаць сучасны і тагачасны архітэктурны выгляд касцёла, мы зрабілі фатаграфію будынка (Мал. 3.):



**Мал. 3. – Крыніца: асабістае фота.**

Як бачым, змянілася толькі сакральная статуя, а ў архітэктурным выглядзе будынка адбыліся толькі нязначныя змены.

Некалькі малюнкаў Н. Орды прысвечаны мястэчку Каралін, якое знаходзілася ва ўсходняй частцы пінскага прадмесця і было пабудавана яшчэ ў канцы XVI ст. паводле рэгулярнага плана (Мал. 4, 5). Гэта пінскае прадмесце знакамітае сваім бастыённым замкам, узведзеным маршалакам Вялікага Княства Літоўскага Янам Дольскім. Пазней замак перайшоў да князей Вішнявецкіх, якія значна мадэрнізавалі яго. Ён пабудаваны ў італьянскім фартыфікацыйным стылі. На жаль, замак неаднаразова разбураўся.



**Мал. 4. – Цыт. па [7, с. 161]**



**Мал. 5. – Цыт. па [7, с. 161]**

Як піша Л. Несцярчук, “на пачатку XIX ст. тут заставаліся два бастыёны і адна курціна” [7, с. 160]. Сёння нават руіны Каралінскага замка зніклі назаўсёды, таму замалёўкі Н.Орды з’яўляюцца не толькі творамі мастацтва, але і вельмі каштоўнымі гістарычнымі дакументамі.

На малюнку Н. Орды “Лешч пад Пінскам” (Мал. 6.), датаваным 1868 годам, адлюстраваны фрагмент Ляшчынскага парку, што ахінаў манастыр і, паводле падання, старажытны капец Міндоўга з крыжом, сімвалам хрысціянства на паганскай тэрыторыі.



**Мал. 6. – Цыт. па [7, с. 162]**

Малюнак зроблены з боку ракі Піны, у цэнтры – двухвежавы касцёл уніяцкага орэна базыльянаў. Малюнак Н. Орды выкананы алоўкам і падпраўлены гуашшу.

Пасля сваёй смерці Н. Орда завяшчаў свае альбомы с малюнкамі стрыечнай сястры А. Бутрымовіч, у чыёй сядзібе ён правёў некалькі год пасля таго, як быў пазбаўлены ўласнага родавага маёнтка. Ён піша: "Мае альбомы з малюнкамі і музычныя запісы на агульную суму 14 тыс. рублёў я перадаю ў рукі Аляксандры Бутрымовіч, каб яна іх прадала. У якасці ўзнагароды за сваю працу яна атрымае 50 руб. ў год і пяць працэнтаў ад атрыманай сумы. Калі праз два гады пасля маёй смерці яшчэ застануцца непрададзеныя альбомы, іх павінны прадаць па аб'яве ў газеце."[10]

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Денисевич, А. Н. Тенденции классицизма и романтизма в архитектурном пейзаже Наполеона Орды / А. Н. Денисевич. – Брест : Брестская типография, 2008. – 116 с.
2. Жилевич, О.Ф. Документы на французском языке Наполеона Орды и его родственников в архиве семьи Денорманди / О. Ф. Жилевич // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки : научно-теоретический журнал. – 2017. – № 1. – С. 16-24.
3. Жылевіч, В.Ф. Невядомы Напалеон Орда : французскія дакументы да біяграфіі з архіва сям'і Дэнармандзі [да 210-годдзя з дня нараджэння мастака і кампазітара] / В. Ф. Жылевіч // Роднае слова : штомесячны навуковы і метадычны часопіс. – 2017. – № 2. – С. 75-77.
4. Климчук, В. Наполеон Орда: творец архитектурного пейзажа / В. Климчук. – Брест : Облтипография, 1998. – 29 с.
5. Левандаускас, В. Иконографические особенности творчества Наполеона Орды / В. Левандаускас // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – С. 51–57.
6. Несцярчук, Л. М. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны // Л. М. Несцярчук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. – 430 с.